Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
_____________ А.І.Жук
"20" 06 2025 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-2-117/ вуч.

**СІНТАКСІС**

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура);
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы))

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), зацверджаных 23.02.2023, рэг. № 049 – 2023/у, рэг. № 048 – 2023/у, рэг. № 50 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Н.П.Лобань, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Н.А.Радзіваноўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
В.В.Урбан, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

М.І.Свістунова, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
А.У.Гранкіна, дацэнт кафедры беларускай і зарубежнай літаратуры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар ДУА «Гімназія № 18 г. Мінска імя І.С.Міранкова» ____________ Ю.В.Новік

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 10 ад 22. 05.2025 г.)
Загадчык кафедры ____________Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 5 ад 17. 06.2025 г.)
Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ____________Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Сінтаксіс” прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)).

Вучэбная праграма па дысцыпліне прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін і займае сярод іх важнае месца. Дысцыпліна “Сінтаксіс” з’яўляецца складнікам модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова”, у якім раскрываюцца асноўныя заканамернасці сінхроннага развіцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы і які выконвае асноўную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. Гэтым вызначаюцца мэта і задачы курса.

**Мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнтаў; сфарміраваць устаноўкі на практычнае прымяненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці; падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для выкладання беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу.

**Задачы вывучэння дысцыпліны**:

– даць грунтоўныя веды аб разнастайных моўных з’явах;

– выпрацаваць навуковыя погляды на сістэму мовы на сінтаксічным узроўні (словазлучэнне, просты сказ, складаны сказ) у сучаснай беларускай літаратурнай мове;

– удасканаліць навыкі беларускага вуснага і пісьмовага маўлення;

– выпрацаваць грунтоўныя ўменні і навыкі самастойнага лінгвістычнага аналізу моўных адзінак, з’яў і фактаў.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.**

Вучэбная дысцыпліна “Сінтаксіс” з’яўляецца дысцыплінай модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова” дзяржаўнага кампанента. У сістэме лінгвістычных дысцыплін “Сінтаксіс” на філалагічных факультэтах займае надзвычай важнае месца пры падрыхтоўцы будучых педагогаў да прафесійнай дзейнасці. Дысцыпліна дазваляе сфарміраваць спецыяльныя (прадметныя) віды функцыянальнай граматнасці – моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай і чытацкай.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.*

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яе з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі (“Уводзіны ў мовазнаўства”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Беларуская дыялекталогія”), а таксама са школьным курсам беларускай мовы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць**:

– сістэму сучаснай беларускай літаратурнай мовы на сінтаксічным узроўні;

– лінгвістычную тэрміналогію;

– літаратурныя (сінтаксічныя) нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– прынцыпы і правілы беларускага правапісу;

**умець:**

– адбіраць, сістэматызаваць і правільна кваліфікаваць моўныя факты;

– праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– выконваць сінтаксічны аналіз словазлучэння, простага сказа, складанага сказа;

– заўважаць і выпраўляць граматычныя памылкі;

**мець навыкі**:

– валодання сінтаксічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асноў культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах;

– правядзення лінгвістычнага моўнага разбору на сінтаксічным узроўні моўнай сістэмы;

– маўленча-камунікатыўнай дзейнасці.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Сінтаксіс” павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступнай кампетэнцыі:

БПК 10: Выкарыстоўваць правілы функцыянавання сінтаксічных сродкаў мовы ў практычнай дзейнасці.

**Структура зместу вучэбнай дысцыпліны.**

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца:

– для вочнай (дзённай) формы атрымання вышэйшай адукацыі ў 5 семестры – 108 гадзін, з іх 56 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 28 гадзін, практычныя заняткі – 28 гадзін, самастойная (пазааўдыторная) работа – 52 гадзіны; у 6 семестры – 120 гадзін, з іх 72 аўдыторныя гадзіны. Размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 36 гадзін, практычныя заняткі – 36 гадзін, самастойная (пазааўдыторная) работа – 48 гадзін.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны – 3 заліковыя адзінкі ў 5 семестры, 3 заліковыя адзінкі ў 6 семестры.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме заліку ў 5-м семестры і экзамену ў 6 семестры.

| семестр | усяго гадзін | аўды-торныя | лекцыі | прак-тычныя | самаст. работа | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 108 | 56 | 28 | 28 | 52 | залік |
| 6 | 120 | 72 | 36 | 36 | 48 | экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## 1. СІНТАКСІС

**1.1 Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго змест і задачы. Словазлучэнне і сказ – асноўныя аб'екты сінтаксісу.**

Асноўныя сінтаксічныя адзінкі (сінтаксема, словазлучэнне, просты сказ, складаны сказ, складанае сінтаксічнае цэлае, тэкст) і паняцці (сінтаксічная сувязь, сінтаксічныя адносіны, сінтаксічнае значэнне). Сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі.

## 2. СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

**2.1 Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа.**

Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні. Разнавіднасці сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў. Класіфікацыя словазлучэнняў паводле галоўнага слова (іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя); паводле сэнсавых адносін кампанентаў (аб'ектныя, атрыбутыўныя (азначальныя), акалічнасныя); паводле структуры (простыя і складаныя). Структурная схема словазлучэння. Пытанне аб тыпах словазлучэнняў у лінгвістычнай літаратуры.

**2.2 Віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні.**

Дапасаванне (поўнае і няпоўнае), кіраванне (прыдзеяслоўнае (слабае і моцнае), прыйменнае, прыадвербіяльнае; прыназоўнікавае і беспрыназоўнікавае), прымыканне (уласнае, іменнае). Сродкі выражэння сувязі. Асаблівасці беларускага кіравання.

**2.3 Сінтаксічны аналіз словазлучэння.**

Апісанне словазлучэння з пункту гледжання структуры, спаянасці кампанентаў, сродкаў іх выражэння, граматычнага значэння, віду сувязі.

## 3. ПРОСТЫ СКАЗ

**3.1 Сказ як сінтаксічная адзінка.**

Асноўныя прыметы сказа: граматычная афармленасць, прэдыкатыўнасць, мадальнасць, сэнсавая завершанасць, інтанацыйная закончанасць. Адрозненне сказа ад словазлучэння і слова. Віды сінтаксічнай сувязі кампанентаў сказа: прэдыкатыўная сувязь (каардынацыя, суразмяшчэнне, прыцягненне), паўпрэдыкатыўная сувязь, далучальная сувязь, злучальная сувязь, падпарадкавальная сувязь.

**3.2 Класіфікацыя простага сказа.**

Тыпы сказаў паводле адносін да рэчаіснасці (сцвярджальныя і адмоўныя). Тыпы сказаў паводле мэты выказвання: апавядальныя (уласна апавядальныя, апісальна-апавядальныя), пытальныя (уласна пытальныя, пытальна-рытарычныя, пытальна-пабуджальныя) і пабуджальныя (уласна пабуджальныя, пажадальныя), іх граматычнае афармленне, асаблівасці інтанацыі. Тыпы сказаў паводле эмацыйнай афарбоўкі (клічныя і няклічныя).

Тыпы сказаў паводле колькасці саставаў (двухсастаўныя і аднасастаўныя); паводле наяўнасці даданых членаў сказа (развітыя і неразвітыя); паводле наяўнасці/адсутнасці структурна неабходных членаў сказа (поўныя і няпоўныя); паводле наяўнасці/адсутнасці элементаў ускладнення (ускладненыя і няўскладненыя сказы); паводле структурнай арганізацыі (чляні́мыя і нечляні́мыя). Структурная схема сказа.

## 4. СТРУКТУРА ДВУХСАСТАЎНАГА СКАЗА

### 4.1 Граматычная аснова (прэдыкатыўнае ядро) простага сказа.

Галоўныя і даданыя члены сказа. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя, недэтэрмінаваныя і дэтэрмінаваныя члены сказа. Дзейнік, яго значэнні. Тыпы дзейніка (намінатыўны, інфінітыўны; просты, складаны, састаўны). Спосабы выражэння дзейніка. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі дзейніка.

Выказнік, яго значэнні.Тыпы выказніка (просты, састаўны, складаны). Просты дзеяслоўны выказнік, яго выражэнне. Састаўныя іменны і дзеяслоўны выказнікі. Выражэнне выказальнага слова. Звязкі, іх тыпы ў іменным і дзеяслоўным выказніках. Складаны выказнік. Размежаванне дзейніка і выказніка, выражаных назоўнікамі назоўнага склону, інфінітывам. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў простым сказе.

### 4.2 Даданыя члены сказа. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа. Дэтэрмінанты.

Даданыя члены сказа. Дапаўненне. Прыдзеяслоўнае (прамое і ўскоснае), прыйменнае, прыадвербіяльнае дапаўненні, іх выражэнне.

Азначэнне. Дапасаванае азначэнне, яго выражэнне. Недапасаванае азначэнне, яго выражэнне рознымі часцінамі мовы. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі дапасаваных і недапасаваных азначэнняў.

Прыдатак як разнавіднасць дапасаванага азначэння. Значэнні прыдаткаў. Адзіночны і развіты (разгорнуты) прыдатак. Размежаванне прыдатка і адзіночнага паяснёнага назоўніка.

Акалічнасці. Віды акалічнасцей (месца, часу, прычыны і інш.), спосабы іх выражэння. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі акалічнасцей.

Размежаванне даданых членаў сказа, выражаных назоўнікамі ўскосных склонаў і інфінітывам. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа. Дэтэрмінаваныя члены сказа (акалічнасці, дапаўненні). Парадак слоў у сказе. Месца галоўных і даданых членаў у сказе. Інверсія і яе стылістычная роля.

## 5. АДНАСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

### 5.1 Структура аднасастаўных сказаў. Галоўны член у аднасастаўных сказах. Праблема класіфікацыі аданасастаўных сказаў.

Аднасастаўныя сказы дзеяслоўнага тыпу (выказнікавыя): пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя і абагульнена-асабовыя сказы; безасабовыя і інфінітыўныя сказы.

Аднасастаўныя сказы іменнага тыпу (дзейнікавыя). Намінатыўныя сказы.

Лінгвістычны статус вакатыўных сказаў, назоўнага тэмы (назоўнага ўяўлення), генітыўных сказаў. Адрозненне гэтых канструкцый ад намінатыўных сказаў і звароткa.

## 6. НЯПОЎНЫЯ СКАЗЫ

**6.1. Тыпы няпоўных сказаў (кантэкстуальныя і сітуацыйныя сказы).**

Эліптычныя сказы. Адрозненне няпоўных сказаў ад намінатыўных і няпэўна-асабовых.

## 7. СЛОВЫ-СКАЗЫ (НЯЧЛЕННЫЯ, НЕПАДЗЕЛЬНЫЯ, НЕРАСЧЛЯНЁНЫЯ СКАЗЫ)

**7.1. Словы-сказы (нячленныя, непадзельныя, нерасчлянёныя сказы).**

Разнавіднасці слоў-сказаў паводле значэння і функцыі, марфалагічнага выражэння.

## 8. КАМУНІКАТЫЎНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СКАЗА

**8.1. Камунікатыўная арганізацыя сказа.**

Сінтаксічнае і актуальнае чляненне сказа. Тэма і рэма.

## 9. ПАРЦЭЛЯЦЫЯ

**9.1. Парцэляцыя як сінтаксічная з’ява.**

Стылістычная роля парцэляцыі.

## 10. УСКЛАДНЕНЫ ПРОСТЫ СКАЗ

**10.1. Агульная характарыстыка ўскладненага простага сказа. Сказы з параўнальнымі канструкцыямі.**

Ускладненне простага сказа як спосаб пашырэння яго структуры.

Спосабы выражэння параўнання. Параўнальныя звароты, іх дзве сэнсавыя разнавіднасці: вобразныя параўнальныя звароты і параўнальна-раўналежныя звароты. Адрозненне параўнальных зваротаў ад даданых параўнальных частак складаназалежнага сказа. Сінтаксічная роля параўнальных зваротаў. Стылістычная роля параўнанняў.

**10.2. Сказы з аднароднымі членамі.**

Паняцце аднароднасці і неаднароднасці членаў сказа. Сувязь аднародных членаў пры дапамозе злучнікаў (спалучальных, супраціўных, размеркавальных) і без злучнікаў. Аднародныя і неаднародныя азначэнні, іх адрозненне. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

**10.3. Сказы з адасобленымі членамі.**

Паняцце адасаблення. Умовы адасаблення. Паўпрэдыкатыўныя і ўдакладняльна-паясняльныя адасобленыя члены сказа. Адасобленыя азначэнні (дапасаваныя і недапасаваныя), прыдаткі, акалічнасці, дапаўненні. Адасобленыя ўдакладняльна-паясняльныя члены сказа (удакладняльныя, паясняльныя, абмежавальна-вылучальныя, далучальныя).

**10.4. Пабочныя канструкцыі.**

Пабочныя канструкцыі (словы, словазлучэнні, сказы). Значэнне і функцыя пабочных канструкцый.

Размежаванне пабочных слоў і аманімічных непабочных.

**10.5. Устаўныя канструкцыі.**

Функцыі ўстаўных канструкцый у сказе. Тыпы ўстаўных канструкцый (адзінкі неканструкцыйнага і канструкцыйнага тыпу; устаўныя словы, спалучэнні, сказы).

Падабенства і адрозненне пабочных і ўстаўных канструкцый. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях.

**10.6. Зваротак. Сінтаксічны аналіз простага сказа.**

Спосабы выражэння зваротка. Неразвітыя і развітыя звароткі; адзіночныя, паўторныя і групавыя звароткі. Функцыі звароткаў у мове. Адрозненне зваротка ад вакатыўнага сказа.

Апісанне сказа паводле мэты выказвання, адносін да рэчаіснасці, эмацыяльнай афарбоўкі, здольнасці вылучаць кампаненты, колькасці саставаў, наяўнасці даданых членаў, паўнаты структуры, элемантаў ускладнення.

## 11. СКЛАДАНЫ СКАЗ

**11.1 Паняцце складанага сказа.**

Структура складанага сказа, адрозненне яго ад простага сказа. Злучэнне і падпарадкаванне як асноўныя віды сінтаксічнай сувязі частак складанага сказа. Сродкі выражэння сувязі і адносін паміж часткамі ў складаным сказе.

Тыпы складаных сказаў: злучнікавыя (складаназлучаныя і складаназалежныя) і бяззлучнікавыя; складаныя сказы з рознымі відамі сувязі.

Пераходныя выпадкі паміж злучэннем і падпарадкаваннем у складаным сказе.

**11.2 Складаназлучаны сказ.**

Агульная характарыстыка складаназлучанага сказа. Складаназлучаныя сказы адкрытай і закрытай структуры. Сувязь частак у складаназлучаным сказе. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі, супраціўнымі, размеркавальнымі злучнікамі.

Выражэнне розных сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа. Аднатыпныя і разнатыпныя часткі ў складаназлучаным сказе.

Складаназлучаныя сказы з далучальнай сувяззю. Сродкі далучальнай сувязі.

Знакі прыпынку паміж часткамі складаназлучанага сказа.

Сінтаксічны аналіз складаназлучанага сказа.

**11.3 Складаназалежны сказ.**

Агульная характарыстыка складаназалежнага сказа. Галоўная і даданая часткі. Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай (злучнікі, злучальныя словы, інтанацыя, трывальна-часавыя формы дзеясловаў-выказнікаў, парадак частак і інш.). Роля ўказальных слоў (займеннікаў і прыслоўяў) у галоўнай частцы. Размежаванне злучнікаў і злучальных слоў.

Прынцыпы класіфікацыі складаназалежных сказаў у сінтаксічнай навуцы.

Складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі, выказнікавымі, дапаўняльнымі, азначальнымі, акалічнаснымі (месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступкі (уступальнымі), спосабу дзеяння, меры і ступені, параўнальнымі), даданымі выніку, супастаўляльнымі, даданымі далучальнымі часткамі.

Адрозненне даданых дзейнікавых і даданых дапаўняльных, даданых выказнікавых і даданых азначальных частак у складаназалежным сказк. Адрозенне даданых прычыны, даданых выніку і даданых уступкі (уступальных) частак у складаназалежным сказе. Адрозненне даданых параўнальных і даданых супастаўляльных у складаназалежным сказе.

Знакі прыпынку паміж часткамі складаназалежнага сказа.

Сінтаксічны аналіз складаназалежнага сказа.

**11.4 Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі.**

Агульная характарыстыка складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі. Сузалежнае і паслядоўнае падпарадкаванне даданых частак. Разнавіднасці сузалежнага падпарадкавання (аднароднае і неаднароднае падпарадкаванне частак). Змешанае падпарадкаванне даданых частак.

Сродкі сувязі частак і знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі.

Сінтаксічны аналіз складаназалежанага сказа з некалькімі даданымі часткамі.

**11.5 Бяззлучнікавы складаны сказ.**

Агульная характарыстыка бяззлучнікавага складанага сказа. Сродкі сувязі частак бяззлучнікавых сказаў.

Бяззлучнікавыя сказы з аднатыпнымі часткамі, сэнсавыя адносіны ў гэтых сказах. Бяззлучнікавыя складаныя сказы адкрытай і закрытай структуры, сэнсавыя адносіны паміж часткамі.

Бяззлучнікавыя сказы з разнатыпнымі часткамі, сэнсавыя адносіны ў гэтых сказах. Бяззлучнікавыя сказы з далучальнымі часткамі.

Знакі прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых сказаў.

Сінтаксічны аналіз бяззлучнікавага складанага сказа.

**11.6 Складаны сказ з рознымі відамі сувязі.**

Агульная характарыстыка складанага сказа з рознымі відамі сувязі. Вылучэнне структурных частак паводле актуальнага члянення сказа. Сродкі сувязі частак у сказах гэтага тыпу.

Разнавіднасці складаных сказаў з рознымі відамі сувязі.

Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

Сінтаксічны аналіз складанага сказа з рознымі відамі сувязі.

# Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны “Сінтаксіс”
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)
## 5 семестр

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін: Лекцыі | Колькасць аўдыторных гадзін: Практычныя | Самастойная праца | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **СІНТАКСІС** | | **28** | **28** | **52** | | | |
| **1.** | **Сінтаксіс** | **2** | | | | | |
| **1.1** | **Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго змест і задачы. Словазлучэнне і сказ – асноўныя аб’екты сінтаксісу.** | | | | | | |
| | Асноўныя сінтаксічныя адзінкі: сінтаксема, словазлучэнне, просты сказ, складаны сказ, складанае сінтаксічнае цэлае, тэкст.<br>Паняцце сінтаксічнай сувязі, сінтаксічных адносін, сінтаксічнага значэння.<br>Сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі | 2 | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Гласарый. | 2-4, дад.1-5 | |
| **2.** | **Словазлучэнне** | **2** | **4** | **6** | | | |
| **2.1** | **Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа.** | | | | | | |
| | Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні. Разнавіднасці сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў.<br>Класіфікацыя словазлучэнняў паводле галоўнага слова (іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя); паводле сэнсавых адносін кампанентаў; паводле структуры (простыя і складаныя).<br>Структурная схема словазлучэння.<br>Пытанне аб тыпах словазлучэнняў у лінгвістычнай літаратуры. | 2 | 1 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Праверка выкананых заданняў. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.2** | **Віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні.** | | | | | | |
| | Дапасаванне (поўнае і няпоўнае), кіраванне (прыдзеяслоўнае (слабае і моцнае), прыйменнае, прыадвербіяльнае; прыназоўнікавае і беспрыназоўнікавае), прымыканне (уласнае, іменнае).<br>Сродкі выражэння сувязі.<br>Асаблівасці беларускага кіравання. | | 1 | 2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| **2.3** | **Сінтаксічны аналіз словазлучэння.** | | | | | | |
| | Апісанне словазлучэння з пункту гледжання структуры, спаянасці кампанентаў, сродкаў іх выражэння, граматычнага значэння, віду сувязі. | | 2 | | Схема сінтаксічнага аналізу (парадак разбору) словазлучэння. | 1-4, дад. 1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. Самастойная праца. |
| **3.** | **Просты сказ** | **2** | **2** | **4** | | | |
| **3.1** | **Сказ як сінтаксічная адзінка.** | | | | | | |
| | Асноўныя прыметы сказа: граматычная афармленасць, прэдыкатыўнасць, мадальнасць, сэнсавая завершанасць, інтанацыйная закончанасць. Адрозненне сказа ад словазлучэння і слова.<br>Віды сінтаксічнай сувязі кампанентаў сказа: прэдыкатыўная сувязь (каардынацыя, суразмяшчэнне, прыцягненне), паўпрэдыкатыўная сувязь, далучальная сувязь, злучальная сувязь, падпарадкавальная сувязь. | 2 | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 2-4, дад.1-7 | |
| **3.2** | **Класіфікацыя простага сказа.** | | | | | | |
| | Тыпы сказаў паводле адносін да рэчаіснасці (сцвярджальныя і адмоўныя).<br>Тыпы сказаў паводле мэты выказвання: апавядальныя (уласна апавядальныя, апісальна-апавядальныя), пытальныя (уласна пытальныя, пытальна-рытарычныя, пытальна пабуджальныя) і пабуджальныя (уласна пабуджальныя, пажадальныя), іх граматычнае афармленне, асаблівасці інтанацыі.<br>Тыпы сказаў паводле эмацыйнай афарбоўкі.<br>Тыпы сказаў паводле колькасці саставаў (двухсастаўныя і | | 2 | 2<br>2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | аднасастаўныя).<br>Тыпы сказаў паводле наяўнасці даданых членаў сказа (развітыя і неразвітыя).<br>Тыпы сказаў паводле наяўнасці/адсутнасці структурна неабходных членаў сказа (поўныя і няпоўныя).<br>Тыпы сказаў паводле наяўнасці/адсутнасці элементаў ускладнення (ускладненыя і няўскладненыя сказы);<br>Тыпы паводле структурнай арганізацыі (члянімыя і нечлянімыя).<br>Струкруная схема сказа. | | | | | | |
| **4.** | **Структура двухсастаўнага сказа** | **8** | **8** | **16** | | | |
| **4.1** | **Граматычная аснова (прэдыкатыўнае ядро) простага сказа.** | | | | | | |
| | Галоўныя і даданыя члены сказа. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя, недэтэрмінаваныя і дэтэрмінаваныя члены сказа.<br>Дзейнік, яго значэнні.<br>Тыпы дзейніка (намінатыўны, інфінітыўны; просты, складаны, састаўны).<br>Спосабы выражэння дзейніка. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі дзейніка. | 2 | 1 | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Выказнік, яго значэнні.<br>Тыпы выказніка (просты, састаўны, складаны). Просты дзеяслоўны выказнік, яго выражэнне.<br>Састаўныя іменны і дзеяслоўны выказнікі. Выражэнне выказальнага слова.<br>Звязкі, іх тыпы ў іменным і дзеяслоўным выказніках.<br>Складаны выказнік.<br>Размежаванне дзейніка і выказніка, выражаных назоўнікамі назоўнага склону, інфінітывам.<br>Каардынацыя дзейніка і выказніка ў простым сказе. | 2 | 1 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 2-4, дад.1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| **4.2** | **Даданыя члены сказа. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа. Дэтэрмінанты.** | | | | | | |
| | Дапаўненне. Прыдзеяслоўнае (прамое і ўскоснае), прыйменнае, прыадвербіяльнае дапаўненні, іх выражэнне.<br>Азначэнне. Дапасаванае азначэнне, яго выражэнне. | 2 | 2 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя | 1-4, дад.1-7 | Індывідуальнае і франтальнае апытванне, |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Недапасаванае азначэнне, яго выражэнне рознымі часцінамі мовы.<br>Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі дапасаваных і недапасаваных азначэнняў. | | | 2 | матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | | праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Прыдатак як разнавіднасць дапасаванага азначэння. Значэнні прыдаткаў.<br>Адзіночны і развіты (разгорнуты) прыдатак. Размежаванне прыдатка і адзіночнага паяснёнага назоўніка.<br>Акалічнасці. Віды акалічнасцей (месца, часу, прычыны і інш.), спосабы іх выражэння.<br>Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі акалічнасцей. | 2 | 2 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Індывідуальнае і франтальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Размежаванне даданых членаў сказа, выражаных назоўнікамі ўскосных склонаў і інфінітывам.<br>Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа.<br>Дэтэрмінаваныя члены сказа (акалічнасці, дапаўненні).<br>Парадак слоў у сказе. Месца галоўных і даданых членаў у сказе. Інверсія і яе стылістычная роля. | | 2 | 2<br>2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| **5.** | **Аднасастаўныя сказы** | **4** | **4** | **6** | | | |
| **5.1** | **Структура аднасастаўных сказаў. Галоўны член у аднасастаўных сказах. Праблема класіфікацыі аднасастаўных сказаў.** | | | | | | |
| | Аднасастаўныя сказы дзеяслоўнага тыпу (выказнікавыя): пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя і абагульнена-асабовыя сказы; безасабовыя і інфінітыўныя сказы. | 2 | 2 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Аднасастаўныя сказы іменнага тыпу (дзейнікавыя). Намінатыўныя сказы.<br>Лінгвістычны статус вакатыўных сказаў, назоўнага тэмы (назоўнага ўяўлення), генітыўных сказаў. Адрозненне гэтых | 2 | 2 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы | 1-4, дад.1-7 | Ушчыльненае апытванне, праверка выкананых |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | канструкцый ад намінатыўных сказаў і зваротка. | | | | (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | | практычных заданняў. |
| **6.** | **Няпоўныя сказы** | **1** | **1** | **2** | | | |
| **6.1** | **Тыпы няпоўных сказаў (кантэкстуальныя і сітуацыйныя сказы).** | | | | | | |
| | Эліптычныя сказы.<br>Адрозненне няпоўных сказаў ад намінатыўных і няпэўна асабовых. | 1 | 1 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| **7.** | **Словы-сказы (нячленныя, непадзельныя, нерасчлянёныя сказы)** | **1** | **1** | | | | |
| **7.1** | **Словы-сказы (нячленныя, непадзельныя, нерасчлянёныя сказы).** | | | | | | |
| | Разнавіднасці слоў-сказаў паводле значэння і функцыі, марфалагічнага выражэння. | 1 | 1 | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| **8.** | **Камунікатыўная арганізацыя сказа** | | **1** | | | | |
| **8.1.** | **Камунікатыўная арганізацыя сказа.** | | | | | | |
| | 1. Сінтаксічнае і актуальнае чляненне сказа.<br>2. Тэма і рэма. | | 1 | | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 2-4, дад.1-7 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| **9.** | **Парцэляцыя** | | **1** | **2** | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **9.1** | **Парцэляцыя як сінтаксічная з’ява.** | | | | | | |
| | 1. Стылістычная роля парцэляцыі. | | 1 | 2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| **10.** | **Ускладнены просты сказ** | **8** | **6** | **16** | | | |
| **10.1** | **Агульная характарыстыка ускладненага простага сказа. Сказы з параўнальнымі канструкцыямі.** | | | | | | |
| | Ускладненне простага сказа як спосаб пашырэння яго структуры. Спосабы выражэння параўнання.<br>Параўнальныя звароты, іх дзве сэнсавыя разнавіднасці: вобразныя параўнальныя звароты і параўнальна-раўналежныя звароты.<br>Адрозненне параўнальных зваротаў ад дадзеных параўнальных частак складаназалежнага сказа.<br>Сінтаксічная роля параўнальных зваротаў. Стылістычная роля параўнанняў. | 2 | 1 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 2-4, дад.1-7 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| **10.2** | **Сказы з аднароднымі членамі.** | | | | | | |
| | Паняцце аднароднасці і неаднароднасці членаў сказа.<br>Сувязь аднародных членаў пры дапамозе злучнікаў (спалучальных, супраціўных, размеркавальных) і без злучнікаў.<br>Аднародныя і неаднародныя азначэнні, іх адрозненне.<br>Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. | 2 | 1 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| **10.3** | **Сказы з адасобленымі членамі.** | | | | | | |
| | Паняцце адасаблення. Умовы адасаблення.<br>Паўпрэдыкатыўныя і ўдакладняльна-паясняльныя адасобленыя члены сказа.<br>Адасобленыя азначэнні, прыдаткі, акалічнасці.<br>Адасобленыя ўдакладняльна-паясняльныя члены сказа (удакладняльныя, паясняльныя, абмежавальна-вылучальныя, далучальныя). | 2 | 1 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме | 1-4, дад.1-7 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | заняткаў. | | |
| **10.4** | **Пабочныя канструкцыі.** | | | | | | |
| | Пабочныя канструкцыі (словы, словазлучэнні, сказы). Значэнне і функцыя пабочных канструкцый.<br>Размежаванне пабочных слоў і аманімічных непабочных. | 1 | 1 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| **10.5** | **Устаўныя канструкцыі.** | | | | | | |
| | Устаўныя канструкцыі, іх функцыі ў сказе. Тыпы ўстаўных канструкцый (адзінкі неканструкцыйнага і канструкцыйнага тыпу; устаўныя словы, спалучэнні, сказы).<br>Падабенства і адрозненне пабочных і ўстаўных канструкцый. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях. | 1 | 1 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| **10.6** | **Зваротак. Сінтаксічны аналіз простага сказа.** | | | | | | |
| | Спосабы выражэння звароткa.<br>Неразвітыя і развітыя звароткі; адзіночныя, паўторныя і групавыя звароткі.<br>Функцыі звароткаў у мове. Адрозненне звароткa ад вакатыўнага сказа. Апісанне сказа паводле мэты выказвання, адносін да рэчаіснасці, эмацыяльнай афарбоўкі, здольнасці вылучаць кампаненты, колькасці скaстаў, наяўнасці даданых членаў, паўнаты структуры, элементаў ускладнення. | | 1 | 2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. Схема сінтаксічнага аналізу (парадак разбору) простага сказа. | 1-4, дад.1-7 | Праверка выкананых практыкаванняў. Самастойная праца. |
| | ***Усяго гадзін у 5 семестры: 108 г.*** | ***28*** | ***28*** | ***52*** | | | ***Залік*** |

## 6 семестр

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін |  | Самастойная праца | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
|  |  | Лекцыі | Практычныя |  |  |  |  |
| **СІНТАКСІС** |  | **36** | **36** | **48** |  |  |  |
| **11.** | **Складаны сказ.** | **36** | **36** | **48** |  |  |  |
| **11.1** | **Паняцце складанага сказа.** | **2** | **2** | **2** |  |  |  |
|  | Паняцце складанага сказа. Структура складанага сказа, адрозненне яго ад простага сказа.<br>Злучэнне і падпарадкаванне як асноўныя віды сінтаксічнай сувязі частак складанага сказа.<br>Сродкі выражэння сувязі і адносін паміж часткамі ў складаным сказе.<br>Тыпы складаных сказаў: злучнікавыя (складаназлучаныя і складаназалежныя) і бяззлучнікавыя; складаныя сказы з рознымі відамі сувязі.<br>Пераходныя выпадкі паміж злучэннем і падпарадкаваннем. | 2 | 2 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Гласарый. Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад.1-7 | Франтальнае і індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| **11.2** | **Складаназлучаны сказ.** | **6** | **4** | **6** |  |  |  |
|  | Складаназлучаны сказ. Агульная характарыстыка складаназлучанага сказа.<br>Складаназлучаныя сказы адкрытай і закрытай структуры.<br>Сувязь частак у складаназлучаным сказе. | 2 |  |  | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 2-4, дад. 1, 2, 3, 4, 5, 7 |  |
|  | Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі, супраціўнымі і размеркавальнымі злучнікамі. | 2 | 1 | 2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 1-7 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Выражэнне розных сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа.<br>Аднатыпныя і разнатыпныя часткі ў складаназлучаным сказе.<br>Складаназлучаныя сказы з далучальнай сувяззю. Сродкі далучальнай сувязі. | 2 | 1 | 4 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 1-7 | Франтальнае і індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | Знакі прыпынку паміж часткамі складаназлучанага сказа. | | 1 | | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 1, 2, 3, 5, 6 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Сінтаксічны аналіз складаназлучанага сказа. | | 1 | | Схема сінтаксічнага аналізу (парадак разбору) складаназлучанага сказа. | 1-4, дад.5, 6, 7 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| **11.3** | **Складаназалежны сказ.** | **14** | **16** | **30** | | | |
| | Складаназалежны сказ. Агульная характарыстыка складаназалежнага сказа.<br>Галоўная і даданая часткі.<br>Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай (злучнікі, злучальныя словы, інтанацыя, трывальна-часавыя формы дзеяслова-выказнікаў, парадак частак і інш.).<br>Роля ўказальных слоў (займеннікаў і прыслоўяў) у галоўнай частцы.<br>Размежаванне злучнікаў і злучальных слоў.<br>Прынцыпы класіфікацыі складаназалежных сказаў у сінтаксічнай навуцы. | 2 | 2 | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 1-7 | Франтальнае і індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Класіфікацыя даданых частак.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі часткамі.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі выказнікавымі часткамі. | 2 | 2 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | | заданняў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі часткамі.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнымі часткамі.<br>Адрозненне даданых дзейнікавых і даданых дапаўняльных, даданых выказнікавых і даданых азначальных частак у складаназалежным сказе. | 2 | 2 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі месца.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі мэты.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі ўмовы. | 2 | 2 | 2<br>2<br>2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Праверка выкананых практыкаванняў. Франтальнае і індывідуальнае апытванне. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі прычыны.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі уступкі (уступальнымі).<br>Складаназалежныя сказы з даданымі часткамі выніку.<br>Адрозенне даданых прычыны, даданых уступкі (уступальных) і даданых выніку частак у складаназалежным сказе. | 2 | 2 | 2<br>2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Праверка выкананых практыкаванняў. Франтальнае апытванне. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі спосабу дзеяння.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі меры і ступені. | 2 | 2 | 2<br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Ушчыльненае апытванне, праверка выкананых |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Адрозненне даданых частак способу дзеяння і даданых частак меры і ступені ў складаназалежным сказе. | | | | матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | | практычных заданняў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі параўнальнымі часткамі.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі супастаўляльнымі часткамі.<br>Адрозненне даданых параўнальных і даданых супастаўляльных у складаназалежным сказе.<br>Складаназалежныя сказы з даданымі далучальнымі часткамі. | 2 | 2 | 2<br>2<br><br><br>2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Знакі прыпынку паміж часткамі складаназалежнага сказа.<br>Сінтаксічны аналіз складаназалежнага сказа. | | 2 | | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. Схема (парадак разбору) сінтаксічнага аналізу складаназалежнага сказа. | 2-4, дад. 5, 6, 7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. Самастойная праца. |
| **11.4** | **Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі.** | **4** | **6** | **4** | | | |
| | Агульная характарыстыка складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі.<br>Сузалежнае і паслядоўнае падпарадкаванне даданых частак. | 2 | 2 | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 1-7 | Індывідуальнае і франтальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Разнавіднасці сузалежнага падпарадкавання (аднароднае, неаднароднае і разнароднае падпарадкаванне частак). | 2 | 1 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме | 1-4, дад. 5, | Ушчыльненае апытванне, |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Змешанае падпарадкаванне даданых частак. | | | 2 | лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 6, 7 | праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Сродкі сувязі частак і знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі. | | 1 | | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Ушчыльненае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Сінтаксічны аналіз складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі. | | 2 | | Схема (парадак разбору) сінтаксічнага аналізу складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 па тэмах 1.3 – 1.4. |
| **11.5** | **Бяззлучнікавы складаны сказ.** | **6** | **4** | **2** | | | |
| | Агульная характарыстыка бяззлучнікавага складанага сказа.<br>Сродкі сувязі частак бяззлучнікавых сказаў. | 2 | | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі). | 2-4, дад. 1-7 | Франтальнае і індывідуальнае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| | Бяззлучнікавыя сказы з аднатыпнымі часткамі, сэнсавыя адносіны ў гэтых сказах.<br>Бяззлучнікавыя складаныя сказы адкрытай і закрытай структуры, сэнсавыя адносіны паміж часткамі. | 2 | 1 | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме | 2-4, дад. 1-7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | заняткаў. | | |
| | Бяззлучнікавыя сказы з разнатыпнымі часткамі, сэнсавыя адносіны ў гэтых сказах.<br>Бяззлучнікавыя сказы з далучальнымі часткамі. | 2 | 1 | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Знакі прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых сказаў. | | 1 | 2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Праверка выкананых практыкаванняў. Франтальнае апытванне |
| | Сінтаксічны аналіз бяззлучнікавага складанага сказа. | | 1 | | Схема (парадак разбору) сінтаксічнага аналізу бяззлучнікавага складанага сказа. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 па тэме 1.5. |
| **11.6** | **Складаны сказ з рознымі відамі сувязі.** | **4** | **4** | **4** | | | |
| | Агульная характарыстыка складанага сказа з рознымі відамі сувязі.<br>Сродкі сувязі частак у сказах гэтага тыпу. | 2 | 1 | | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 2-4, дад. 1-7 | Праверка выкананых практыкаванняў. Франтальнае і індывідуальнае апытванне |
| | Вылучэнне структурных частак у складаным сказе з рознымі відамі сувязі паводле актуальнага члянення сказа.<br>Разнавіднасці складаных сказаў з рознымі відамі сувязі. | 2 | 1 | 2 | Мультымедыя (прэзентацыя па тэме лекцыі).<br>Наглядныя матэрыялы | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Выніковы тэст |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | | |
| | Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі. | | 1 | 2 | Наглядныя матэрыялы (кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні) па тэме заняткаў. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | Сінтаксічны аналіз складанага сказа з рознымі відамі сувязі. | | 1 | | Схема (парадак разбору) сінтаксічнага аналізу складанага сказа з рознымі відамі сувязі. | 1-4, дад. 5, 6, 7 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 3 па тэме 1.6. |
| | ***Усяго гадзін у 6 семестры: 120 г.*** | ***36*** | ***36*** | ***48*** | | | ***Экзамен*** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы [Электронны рэсурс] : практыкум : вучэб. дапам. / І. Л. Бурак [і інш.] ; навук. рэд. І. Л. Бурак // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/bitstream/doc/4320. – Дата доступу: 12.04.2025.

2. Сучасная беларуская літаратурная мова : падручнік / Д. В. Дзятко, Н. П. Лобань, С. С. Мароз [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Выш. шк., 2024. – 591 с.

3. Сучасная беларуская літаратурная мова [Электронны рэсурс] : вучэб. дапам. / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/27507. – Дата доступу: 12.04.2025.

4. Сучасная беларуская літаратурная мова [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс / склад.: Н. П. Лобань [і інш.] // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/44203. – Дата доступу: 12.04.2025.

**Дадатковая літаратура**

1. Беларуская мова: энцыклапедычны даведнік : [больш за 290 артыкулаў / пад агульнай рэдакцыяй Д. В. Дзятко]. – Мінск : Беларусь, 2022. – 495 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Ч. 2 : Сінтаксіс. – 239 с.

3. Маршэўская, В. В. Сучасная беларуская мова: сінтаксіс : дапаможнік / В. В. Маршэўская. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2008. – 257 с.

4. Плотнікаў, Б. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. – Мінск : Інтэрпрэссэрвіс : Кн. дом, 2003. – 672 с.

5. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапам. / В. У. Азарка [і інш.] ; пад рэд. А. С. Васілеўскай. – Мінск : Рэсп. ін-т праф. адукацыі, 2020. – 383 с.

6. Сучасная беларуская літаратурная мова: тэсты для тэматычнага кантролю : вучэб. дапам. / аўт.-склад.: А. І. Калечыц [і інш.] ; пад рэд. П. А. Міхайлава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2006. – 280 с.

7. Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы : падруч. для студэнтаў / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з’яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодваць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з’яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб’ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзення самастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных работ;

– выкананне рэйтынгавых кантрольных работ, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых работ;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняў для самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плана тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі;

– азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў.

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю);

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

| № п/п | Назва АС | Кароткая характарыстыка ацэначнага сродку | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1 | Рэферат | Прадукт самастойнай працы студэнта, які ўяўляе сабой кароткі выклад у пісьмовым выглядзе атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай навуковай (навучальна- | Тэмы рэфератаў адлюстраваны ў раздзеле “Прыкладная тэматыка дакладаў, рэфератаў і |

| № п/п | Назва АС | Кароткая характарыстыка ацэначнага сродку | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| | | даследчай) тэмы, дзе аўтар раскрывае сутнасць доследнай праблемы, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе. | прэзентацый”. |
| 2 | Даклад | Прадукт самастойнай працы студэнта, публічнае выступленне з прадстаўленнем атрыманых вынікаў рашэння пэўнай вучэбна-практычнай, вучэбна-даследчай або навуковай тэмы. | Тэмы дакладаў адлюстраваны ў раздзеле “Прыкладная тэматыка дакладаў, рэфератаў і прэзентацый”. |
| 3 | Мульты-медыйная прэзента-цыя | Прадстаўленне зместу вучэбнага матэрыялу, вучэбнай задачы з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій. | Тэматыка прэзентацый адлюстравана ў раздзеле “Прыкладная тэматыка дакладаў, рэфератаў і прэзентацый”. |
| 4 | Тэст | Сістэма фармалізаваных заданняў, па выніках выканання якіх можна меркаваць аб узроўні валодання інфармацыяй, аб ведах, уменнях і навыках. | Тэставыя заданні па сінтаксісе адлюстраваны ў раздзеле “Выніковы тэст”, а таксама ў СДН MOODLE. |
| 5 | Гласарый | Алфавітны спіс тэрмінаў, якія датычацца пэўнага пытання, і іх значэнняў. | Тэматыка адлюстравана ў раздзеле “Гласарый” |

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойнай працы, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з’яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная праца студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай працы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні задання. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г. з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ "СІНТАКСІС" (СЛОВАЗЛУЧЭННЕ. ПРОСТЫ СКАЗ)

***Тэма 2.1*** Структурная схема словазлучэння. Пытанне аб тыпах словазлучэнняў у лінгвістычнай літаратуры.

*Заданне*

*I узровень*

З прапанаванага тэксту выпісаць 2 словазлучэнні (субстантыўнае і дзеяслоўнае) і зрабіць іх сінтаксічны аналіз.

*II узровень*

З прапанаванага тэксту выпісаць усе магчымыя словазлучэнні. Зрабіць сінтаксічны аналіз словазлучэнняў і пабудаваць іх структурныя схемы, карыстаючыся агульнапрынятымі сімваламі.

*III узровень*

З прапанаванага тэксту выпісаць усе магчымыя словазлучэнні. Зрабіць сінтаксічны аналіз словазлучэнняў, пабудаваць іх структурныя схемы, карыстаючыся агульнапрынятымі сімваламі. У адпаведнасці з кожнай структурнай схемай запісаць прыклад уласна складзенага словазлучэння.

*Тэкст да задання*

Дзьмулі жнівеньскія вільготныя вятры, гналі з узмор'я свінцовыя хмары, засцілаючы блакітнае неба. Навокал, нібы дываны, раскінуты цёмна-зялёныя сенажаці. На адным баку балотнай паўнаводнай рэчкі, якая змейкай выкручвалася сярод кустоў лазы, на невялічкай градзе ўзвышаліся кучаравыя бярозы. У рэчку упалі пакручаныя лісці, вецер пагнаў іх да чаротаў, што раслі абапал топкіх берагоў.

І. Гурскі. "Перад бурай".

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ "СІНТАКСІС"

**дзённая форма атрымання адукацыі**

## 5 семестр

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 2.1. | Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні. Разнавіднасці сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў. Класіфікацыя словазлучэнняў. | 2 | Падрыхтаваць канспект раздзела "Словазлучэнне: Лінгвістычны статус словазлучэння. Структурныя тыпы словазлучэнняў" // Рагаўцоў, В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні: дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Мінск, 2001. – 199 с. | Канспект |
| | Класіфікацыя словазлучэнняў паводле галоўнага слова; паводле сэнсавых адносін кампанентаў; паводле структуры. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 406, № 408 і № 415 // "Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі" (Мінск, 1989). | Практыка-ванні |
| 2.2. | Асаблівасці беларускага кіравання | 2 | Пабудаваць словазлучэнні з кіраваннем, выкарыстоўваючы табліцу "Спецыфіка кіравання ў беларускай мове ў параўнанні з рускай" // Рамза, Т. Р. Сінтаксіс: тэарэтычны курс : вучэб. дапам. / Т. Р. Рамза. – Мінск : БДУ, 2006. – С. 40–42. | Практыка-ванні |
| 3.2. | Тыпы сказаў паводле мэты выказвання, іх граматычнае афармленне, асаблівасці інтанацыі. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 423, № 408 і № 415 // "Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі" (Мінск, 1989). | Практыка-ванні |
| | Тыпы сказаў паводле колькасці саставаў (двухсастаўныя і аднасастаўныя) | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 15 двухсастаўных і 15 аднасастаўных сказаў. | Картатэка моўных фактаў. |
| 4.1. | Тыпы выказніка (просты, састаўны, складаны) | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў па 10 прыкладаў на кожны тып выказніка. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Каардынацыя дзейніка і выказніка ў простым сказе | 2 | Падрыхтаваць канспект раздзела "Каардынацыя выказніка і дзейніка ў ліку і родзе" // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с. | Канспект |
| 4.2. | Дапаўненне. Прыдзеяслоўнае (прамое і ўскоснае), прыйменнае, прыадвербіяльнае дапаўненні, іх выражэнне. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 41 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с. | Практыка-ванні |
| | Сінтаксічна непадзельныя | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 46 // | Практыка- |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | словазлучэнні ў ролі дапасаваных і недапасаваных азначэнняў. | | Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | ванне |
| | Адзіночны і развіты (разгорнуты) прыдатак. Размежаванне прыдатка і адзіночнага паяснёнага назоўніка | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 48 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыка-ванне |
| | Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі акалічнасцей. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 51 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыка-ванне |
| | Размежаванне даданых членаў сказа, выражаных назоўнікамі ўскосных склонаў і інфінітывам. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 54 і 55 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыка-ванне |
| | Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула “Пра размежаванне членаў сказа” І. Я. Лепешава // Беларуская мова:хрэстаматыя: вучэбны дапаможнік / аўт.-склад. З.І. Бадзевіч і інш. – Мінск : 2005. – 592 с. | Канспект |
| 5.1. | Аднасастаўныя сказы дзеяслоўнага тыпу (выказнікавыя): пэўна асабовыя, няпэўна асабовыя і абагульнена асабовыя сказы; безасабовыя і інфінітыўныя сказы. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 89 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыка-ванне |
| | Аднасастаўныя сказы іменнага тыпу (дзейнікавыя). Намінатыўныя сказы. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 94 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыка-ванне |
| | Лінгвістычны статус вакатыўных сказаў, назоўнага тэмы (назоўнага ўяўлення), генітыўных сказаў. Адрозненне гэтых сказаў ад намінатыўных і зваротка. | 2 | Выпісаць з мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў па 10 сказаў кожнага тыпу. | Картатэка моўных фактаў. |
| 6.1 | Эліптычныя сказы. | 2 | Падрыхтаваць канспект раздзела “Лінгвістычная сутнасць эліптычных сказаў” // Рагаўцоў, В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні: дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Мінск, 2001. – 199 с. | Канспект |
| 9.1. | Стылістычная роля парцэляцыі. | 2 | Падрыхтаваць канспект раздзела “Парцэляцыя” // Леановіч, Р. С. Беларуская мова: сінтаксіс словазлучэння і простага | Канспект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | сказа : вучэб. дапам. / Р. С. Леановіч. – Гродна : ГрДУ, 2002. – 118 с. | |
| 10.1. | Адрозненне параўнальных зваротаў ад дададзеных параўнальных частак складаназалежнага сказа | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 77 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыкаванне |
| 10.2. | Сувязь аднародных членаў пры дапамозе злучнікаў (спалучальных, супраціўных, размеркавальных) і без злучнікаў. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 58 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыкаванне |
| | Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 506 // "Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі" (Мінск, 1989). | Практыкаванне |
| 10.3. | Адасобленыя азначэнні (дапасаваныя і недапасаваныя), прыдаткі, акалічнасці | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 509 // "Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі" (Мінск, 1989). | Практыкаванне |
| | Адасоблнеыя ўдакладняльна-паясняльныя члены сказа (удакладняльныя, паясняльныя, абмежавальна-вылучальныя, далучальныя). | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 522 // "Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі" (Мінск, 1989). | Практыкаванне |
| 10.4 | Размежаванне пабочных слоў і аманімічных непабочных. | 2 | Падрыхтаваць канспект раздзела "Размежаванне пабочных слоў і аманімічных непабочных" // Рагаўцоў, В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні: дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Мінск, 2001. – 199 с. | Канспект |
| 10.5. | Падабенства і адрозненне пабочных і ўстаўных канструкцый. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 544 // "Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі" (Мінск, 1989). | Практыкаванне |
| 10.6. | Функцыі звароткаў у мове. Адрозненне звароткa ад вакатыўнага сказа | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 80 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. –286 с. | Практыкаванне |
| | **Усяго** | **52** | | |

## 6 семестр

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 11.1. | Тыпы складаных сказаў: злучнікавыя (складаназлучаныя і складаназалежныя) і бяззлучнікавыя; складаныя сказы з рознымі відамі сувязі. | 2 | Падрыхтаваць канспект раздзела “Тыпалогія складаных сказаў” // Рамза, Т. Р. Сінтаксіс: тэарэтычны курс : вучэб. дапам. / Т. Р. Рамза. – Мінск : БДУ, 2006. – С. 119–137. | Канспект |
| 11.2. | Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі, супраціўнымі і размеркавальнымі злучнікамі. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 555 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1989). | Практыка-ванні |
| | Складаназлучаныя сказы з далучальнай сувяззю. Сродкі далучальнай сувязі. | 4 | Падрыхтаваць канспект і вуснае паведамленне па тэме “Складаназлучаныя сказы з далучальнай сувяззю. Сродкі далучальнай сувязі”, выкарыстаць вучэбны дапаможнік (Бурак, Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс / Л. І. Бурак. – Мінск : Універсітэцкае, 1987. – 322 с.). | Канспект. Вуснае паведа-мленне |
| 11.3. | Складаназалежныя сказы з даданымі выказнікавымі часткамі. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі выказнікавымі часткамі. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі часткамі. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі дапаўняльнымі часткамі. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнымі часткамі. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі азначальнымі часткамі. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі месца. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі месца. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі часу. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі ўмовы. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі ўмовы. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі прычыны. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі прычыны. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі мэты. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі мэты. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 | Картатэка |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | даданымі акалічнаснымі часткамі уступкі (уступальнымі). | | складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі уступкі (уступальнымі). | моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі спосабу дзеяння. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі спосабу дзеяння. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі меры і ступені. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі акалічнаснымі часткамі меры і ступені. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі параўнальнымі часткамі . | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі параўнальнымі часткамі. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі часткамі выніку. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі часткамі выніку. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі супастаўляльнымі часткамі. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі супастаўляльнымі часткамі. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складаназалежныя сказы з даданымі далучальнымі часткамі. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з даданымі далучальнымі часткамі. | Картатэка моўных фактаў. |
| 11.4. | Разнавіднасці сузалежнага падпарадкавання (аднароднае і неаднароднае падпарадкаванне частак). | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з сузалежным аднародным падпарадкаваннем частак і 10 складаназалежных сказаў з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем частак.. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Змешанае падпарадкаванне даданых частак. | 2 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў 10 складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі са змешаным падпарадкаваннем частак. | Картатэка моўных фактаў. |
| 11.5. | Знакі прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых сказаў. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 131 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с. | Практыка -ванне |
| 11.6. | Разнавіднасці складаных сказаў з рознымі відамі сувязі. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю паведамленне “Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, знакі прыпынку ў іх”, выкарыстоўваючы матэрыял інтэрнэт-рэсурсаў і дадатковую літаратуру па тэме “Сінтаксіс”. | Прэзента-цыя |
| | Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі | 2 | Падрыхтаваць вуснае паведамленне “Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, знакі прыпынку ў іх”, выкарыстоўваючы матэрыял інтэрнэт-рэсурсаў і дадатковую літаратуру па тэме “Сінтаксіс”. | Вуснае паведам-ленне |
| | **Усяго** | **48** | | |

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб узроўні паспяховасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Сінтаксіс” мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю выкарыстоўваецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

З мэтай выніковай дыягностыкі якасці засваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Сінтаксіс” вучэбным планам прадугледжана правядзенне кантрольных работ рознага віду. Пры падборы заданняў улічваецца аб’ём тэарэтычных звестак па пэўнай тэме, індывідуальны ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў і інш.

Апераджальная, бягучая і прамежкавая дыягностыка кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне “Сінтаксіс” можа мець розныя формы, сярод якіх:

– вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках;

– пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, дыктанты для самакантролю, рэйтынгавыя кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты (даклады);

– графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме);

– тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу;

– абарона падрыхтаванага студэнтам рэферата (вуснага паведамлення, даклада): пры ацэньванні рэферата (вуснага паведамлення, даклада) увага звяртаецца на: змест і паслядоўнасць выкладу матэрыялу; адпаведнасць і паўнату раскрыцця тэмы; самастойнасць разважанняў і афармленне (у тым ліку прэзентацыі).

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах рэкамендуецца выкарыстоўваць тэсты і тэставыя заданні, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ВУСНЫХ ПАВЕДАМЛЕННЯЎ, РЭФЕРАТАЎ І ПРЭЗЕНТАЦЫЙ

1. Сінтаксічная сувязь паміж дзейнікам і выказнікам: каардынацыя ці дапасаванне?
2. Кіраванне пры прамым дапаўненні.
3. Асаблівасці ўжывання асобных сінтаксічных канструкцый: *на Беларусі ці ў Беларусі*?
4. Асаблівасці ўжывання асобных сінтаксічных канструкцый: *гвалт над кім-чым ці з каго-чаго*?
5. Пра размежаванне членаў сказа.
6. Абагульнена-асабовыя сказы і прыказкі.
7. Актуальнае чляненне сказа.
8. Праблемы семантычнага сінтаксісу беларускай мовы.
9. Сінтаксічныя асаблівасці складанага сказа.
10. Складаны сказ і яго інтанацыйныя асаблівасці.
11. Віды складаных сказаў і іх класіфікацыя.
12. Развіццё складаназалежнага сказа ў беларускай мове.
13. Тыпалогія складаназалежнага сказа ва ўсходнеславянскіх мовах.
14. Пра размежаванне тыпаў даданых сказаў, злучнікаў і злучальных слоў.
15. Складаназлучаныя сказы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.
16. З гісторыі станаўлення і развіцця тэорыі бяззлучнікавага складанага сказа ва ўсходнеславянскім мовазнаўстве.

# ГЛАСАРЫЙ

**Адмоўны сказ** – сказ, у якім адмаўляецца наяўнасць або магчымасць пэўных з'яў і падзей рэчаіснасці.
**Аднасастаўны сказ** – сказ, у якім ёсць толькі адзін састаў - дзейніка або выказніка.
**Апавядальны сказ** – сказ, у якім паведамляецца аб розных з'явах і падзеях як пэўных фактаў рэчаіснасці.
**Двухсастаўны сказ** – сказ, які мае састаў дзейніка і састаў выказніка.
**Інверсія** – такая расстаноўка слоў або словазлучэнняў (сінтаксічных кампанентаў) у сказе, якая парушае іх звычайны граматычны парадак.
**Неразвіты сказ** – сказ, які складаецца толькі з галоўных членаў сказа.
**Няпоўны сказ** – сказ, у складзе якога адсутнічаюць адзін ці больш кампанентаў, неабходных для дадзенай структуры.
**Няўскладнены сказ** – сказ, у складзе якого няма кампанентаў, якія ўскладняюць структуру.
**Пабуджальны сказ** – сказ, у якім выражаецца волевыяўленне таго, хто гаворыць.
**Парцэляцыя** – падзел сказа на некалькі асобна аформленых паведамленняў.
**Поўны сказ** – сказ, у складзе якога ёсць усе структурна неабходныя кампаненты.
**Просты сказ** – сказ, які мае адну граматычную аснову.
**Пытальны сказ** – сказ, у якім змешчана пытанне.
**Развіты сказ** – сказ, у якім, акрамя галоўных членаў сказа, ёсць і даданыя.
**Сінтаксічны паралелізм** – экспрэсіўная сінтаксічная фігура, у якой кожная наступная сінтаксічная адзінка будуецца па тыпу папярэдняй – мае аднолькавы склад членаў сказа, аднолькавы парадак слоў, што стварае ўнутраную сіметрыю.
**Сказ** – мінімальная граматычная і інтанацыйна цэласная адзінка мовы (маўлення), якая з’яўляецца асноўным сродкам фарміравання, выражэння і паведамлення думкі, волевыяўлення і эмоцый чалавека.
**Складанае сінтаксічнае цэлае (ССЦ)** – полікамунікацыйная сінтаксічная адзінка, што арганізавана з двух ці больш самастойных сказаў (простых або складаных), аб’яднаных адпаведнымі сродкамі сувязі і па сэнсе.
**Складаны сказ** – сказ, у складзе якога можна вылучыць дзве і больш граматычныя асновы.
**Сцвярджальны сказ** – сказ, у якім адзначаецца наяўнасць або магчымасць розных з'яў і падзей рэчаіснасці.
**Ускладнены сказ** – сказ, у склад якога ўваходзяць аднародныя і адасобленыя члены сказа, параўнальныя звароты, звароткі, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі.

## ВЫНІКОВЫ ТЭСТ

**1. Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы.**

- намоклі паленні
- ажаніцца з прыгажуняй
- створаны на ўзор
- неабходная запіс
- пасмяяцца з брата

**2. Адзначце сказы, у якіх правільна вызначана азначэнне.**

- На роднай мове чалавеку лягчэй выказваць СВАЕ думкі.
- ДАРОСЛЫ дапамог замацаваць на дрэве шпакоўню.
- Жаданне ПАПЛАВАЦЬ прывяло мяне на рэчку.
- Рукі печніка былі МАЗОЛІСТЫМІ.
- У маёй сумцы ляжаў нататнік,УЗЯТЫ ДЛЯ ЗАПІСУ ЎРАЖАННЯЎ.

**3. Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.**

- Апетыт пасля трэніроўкі будзь здароў!
- Ліставёрткі галоўныя шкоднікі лясоў.
- Маладая траўка нібы зялёны дыван.
- Пісаць іерогліфы сапраўднае мастацтва.
- Воўк не пастух, свіння не агародніца.

**4. Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку.**

- Летняя ноч ззяла бліскавіцамі, і палохала зарніцамі, і мокрым ветрыкам шумела.
- У жыцці без дабрыні, без спагады ні туды, ні сюды.
- Ходзяць жураўлі і па травах свежых, і па балотах, і цешацца красою зямлі.
- Цвілі пахучыя, лугавыя кветкі, вабілі пчолак салодкім мёдам.
- Дабрыня, спагадлівасць, чуласць - усё гэта патрэбна кожнаму з нас.

**5. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі).**

- Іду праз беласнежныя_ быццам вэлюм_ сады.
- Мне кнігі патрэбны_ як паветра.
- Са старажытнасці ў беларускай паэзіі ружа выступала_ як кветка-сімвал.
- Чырванелі_ што зарніцы_ на палянах брусніцы.

- На кожным полі_ быццам вартавыя_ стаялі снапы.

**6. Адзначце сказы, у якіх прапушчаны знак (знакі) прыпынку.**

- Пятро заўзяты падарожнік паказваў мастаку прыгожыя мясціны.
- Адкрылася мне ісціна бясспрэчная: гуляючы розуму не прыдбаеш.
- Слухаючы песні параходаў думаю: ці чаромха пахне мёдам, ці мёд прапах чаромхай?
- Перазвоньваюцца між сабой спаленыя ў Хатыні хаты.
- У двары гулялі хлопчыкі, самы высокі з іх быў замест камандзіра.

**7. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі.**

- Елку так абляпіў снег, што яна_ здаецца_ казачнай.
- Ніхто_ аднак_ не згадзіўся на прапанову настаўніка.
- Адзін_ вядома_ і ў полі не воін.
- Вясной часам бывае_ нават_ тры пахаладанні.
- Слаўся_ восень_ дажджамі багатымі.

**8. Адзначце складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць коску.**

- То жураўлі паклічуць гучна з неба то з кроны ціха кіне восень ліст.
- У цішы новай хаты спаць уся сям'я лягла а з неба месячык рагаты паслаў праменьчыкі святла.
- Святочна і весела.
- Нагінаюць галовы ў росах васількі і пра нешта сваё шэпчуцца лозы ля ракі.
- Хутка парадуюць вока блакітныя званочкі і сагрэюць душу цюльпаны.

**9. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі).**

- Беларускія зубры_ якія нарадзіліся ў Польшчы_ носяць клічкі на літару "п".
- Не бядуй, што восень блізка_ і што на дол ужо кладзецца цень.
- Калі ёсць жаданне_ з'явіцца ўменне.
- Пакланіўся нізка абеліску чалавек_ які вызваляў сваю зямлю.
- Сёння бацька расказаў, што_ калі ў двары пачалі капаць яму, то наткнуліся на скарб.

**10. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е.**

- Спрадвеку ў нас так вядзецца_ самае лепшае аддаём дзецям.
- Мне шкада пралесак ранніх_ без цяпла яны растуць і без святла.
- Устане сонца_ пачнецца гудзенне і шапаценне.

- Мама, ты вучыла нас_ трэба шанаваць сваю і чужую працу.
- Міла бомы смяюцца ўцішы_ ціха срэбрам грукае крыніца.

**11. Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць сказу з простай мовай.**

*"Гэты год будзе надзвычай багаты на яблыкі"_ заўважыла мама.*

- У сказе адсутнічае працяжнік.
- У сказе прапушчана коска.
- У сказе прапушчана кропка.
- У сказе прапушчана двукроп'е.
- Простая мова няправільна заключана ў двукоссе.

**12. Адзначце аднасастаўныя сказы.**

- Наш сінявокі край, у шчасці расцвітай!
- Салаўя байкамі не кормяць.
- Надзвычай цікава назіраць за птушкамі.
- Сустракаць Новы год заўсёды прыемна.
- Мае дзіцячыя ўспаміны пяшчотныя, светлыя.

**13. Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць складанаму сказу з рознымі відамі сувязі частак.**

*Андрэй сядзеў у купэ каля акна і калі з поля зроку зніклі апошнія будынкі горада, ён адчуў моцна зашчымела сэрца ад невядомага яму смутку.*

- паміж часткамі сказа прапушчана двукроп'е
- паміж часткамі сказа прапушчаны тры коскі
- паміж часткамі сказа прапушчаны працяжнік
- паміж часткамі сказа прапушчаны дзве коскі
- паміж часткамі сказа прапушчана адна коска

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “СІНТАКСІС” (СЛОВАЗЛУЧЭННЕ. ПРОСТЫ СКАЗ)

1. Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго змест і задачы. Сувязь сінтаксісу з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Асноўныя аб’екты сінтаксісу.

2. Сінтаксічныя адзінкі: сінтаксема, словазлучэнне, просты сказ, складаны сказ, складанае сінтаксічнае цэлае, тэкст.

3. Паняцце сінтаксічнай сувязі, сінтаксічных адносін, сінтаксічнага значэння. Сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі.

4. Асноўныя аспекты апісання сінтаксісу – структурны, камунікацыйны, функцыянальны, семантычны.

5. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа. Пытанне аб тыпах словазлучэнняў у лінгвістычнай літаратуры.

6. Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні. Разнавіднасці сінтаксічна непадзельных словазлучэнняў.

7. Класіфікацыя словазлучэнняў паводле галоўнага слова (іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя); паводле сэнсавых адносін кампанентаў (аб’ектныя, атрыбутыўныя (азначальныя), акалічнасныя; паводле структуры (простыя і складаныя).

8. Віды падпарадкавальнай сувязі слоў. Дапасаванне (поўнае і няпоўнае), сродкі выражэння сувязі.

9. Кіраванне (прыдзеяслоўнае (слабае і моцнае), прыйменнае, прыадвербіяльнае; прыназоўнікавае і беспрыназоўнікавае), сродкі выражэння сувязі.

10. Прымыканне (уласнае, іменнае), сродкі выражэння сувязі.

11. Асаблівасці беларускага кіравання.

12.Сінтаксічны аналіз словазлучэння.

13. Сказ як сінтаксічная адзінка. Асноўныя прыметы сказа. Адрозненне сказа ад словазлучэння і слова.

14. Віды сінтаксічнай сувязі кампанентаў сказа: прэдыкатыўная сувязь (каардынацыя, суразмяшчэнне, прыцягненне), паўпрэдыкатыўная сувязь, далучальная сувязь, злучальная сувязь, падпарадкавальная сувязь.

15. Тыпы сказаў паводле адносін да рэчаіснасці (сцвярджальныя і адмоўныя). Тыпы сказаў паводле эмацыйнай афарбоўкі (клічныя і няклічныя).

16. Тыпы сказаў паводле мэты выказвання: апавядальныя (уласна апавядальныя, апісальна-апавядальныя), пытальныя (уласна пытальныя, пытальна-рытарычныя, пытальна-пабуджальныя) і пабуджальныя (уласна пабуджальныя, пажадальныя), іх граматычнае афармленне, асаблівасці інтанацыі.

17. Тыпы сказаў паводле колькасці саставаў (двухсастаўныя і аднасастаўныя); паводле наяўнасці даданых членаў сказа (развітыя і неразвітыя); паводле наяўнасці/адсутнасці структурна неабходных членаў сказа (поўныя і няпоўныя); паводле наяўнасці/адсутнасці элементаў ускладнення

(ускладненыя і няўскладненыя сказы); паводле структурнай арганізацыі (члянімыя і нечлянімыя).

18. Граматычная аснова (прэдыкатыўнае ядро) простага сказа. Галоўныя і даданыя члены сказа.

19. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа. Дэтэрмінанты.

20. Дзейнік, яго значэнні. Тыпы дзейніка (намінатыўны, інфінітыўны; просты, складаны, састаўны). Спосабы выражэння дзейніка. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі дзейніка.

21. Выказнік, яго значэнні.Тыпы выказніка (просты, састаўны, складаны). Складаны выказнік.

22. Просты дзеяслоўны выказнік, яго выражэнне.

23. Састаўныя іменны выказнік. Выражэнне выказальнага слова. Звязкі, іх тыпы ў іменным выказніку.

24. Састаўныя дзеяслоўны выказнік. Выражэнне выказальнага слова. Звязкі, іх тыпы ў дзеяслоўным выказніку.

25. Складаны выказнік, яго выражэнне.

26. Размежаванне дзейніка і выказніка, выражаных назоўнікамі назоўнага склону, інфінітывам.

27. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў простым сказе.

28. Даданыя члены сказа. Дапаўненне. Прыдзеяслоўнае (прамое і ўскоснае), прыйменнае, прыадвербіяльнае дапаўненні, іх выражэнне.

29. Азначэнне. Дапасаванае азначэнне, яго выражэнне.

30. Азначэнне. Недапасаванае азначэнне, яго выражэнне рознымі часцінамі мовы.

31. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі дапасаваных і недапасаваных азначэнняў.

32. Прыдатак як разнавіднасць дапасаванага азначэння. Значэнні прыдаткаў. Адзіночны і развіты (разгорнуты) прыдатак.

33. Размежаванне прыдатка і адзіночнага паяснёнага назоўніка.

34. Акалічнасці. Віды акалічнасцей (месца, часу, прычыны і інш.), спосабы іх выражэння. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў ролі акалічнасцей.

35. Размежаванне даданых членаў сказа, выражаных назоўнікамі ўскосных склонаў і інфінітывам. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа.

36. Дэтэрмінаваныя члены сказа (акалічнасці, дапаўненні).

37. Парадак слоў у сказе. Месца галоўных і даданых членаў у сказе. Інверсія і яе стылістычная роля.

38. Аднасастаўныя сказы. Структура аднасастаўных сказаў. Галоўны член у аднасастаўных сказах. Праблема класіфікацыі аднасастаўных сказаў.

39. Аднасастаўныя сказы дзеяслоўнага тыпу (выказнікавыя): пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя і абагульнена-асабовыя сказы.

40. Аднасастаўныя сказы дзеяслоўнага тыпу (выказнікавыя): безасабовыя і інфінітыўныя сказы.

41. Аднасастаўныя сказы іменнага тыпу (дзейнікавыя). Намінатыўныя сказы.

42. Вакатыўныя сказаў, назоўны тэмы (назоўны ўяўлення), генітыўныя сказы. Адрозненне гэтых канструкцый ад намінатыўных сказаў і зваротка.

43. Няпоўныя сказы. Тыпы няпоўных сказаў (кантэкстуальныя і сітуацыйныя сказы). Эліптычныя сказы. Адрозненне няпоўных сказаў ад намінатыўных і няпэўна-асабовых.

44 Словы-сказы (нячленныя, непадзельныя, нерасчлянёныя сказы), іх разнавіднасці паводле значэння і функцыі, марфалагічнага выражэння.

45. Камунікатыўная арганізацыя сказа. Сінтаксічнае і актуальнае чляненне сказа. Тэма і рэма.

46. Парцэляцыя як сінтаксічная з'ява. Стылістычная роля парцэляцыі.

47. Ускладнены просты сказ. Агульная характарыстыка. Ускладненне простага сказа як спосаб пашырэння яго структуры.

48. Сказы з аднароднымі членамі. Паняцце аднароднасці і неаднароднасці членаў сказа. Сувязь аднародных членаў пры дапамозе злучнікаў (спалучальных, супраціўных, размеркавальных) і без злучнікаў.

49. Аднародныя і неаднародныя азначэнні, іх адрозненне.

50. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

51. Сказы з адасобленымі членамі. Паняцце адасаблення. Умовы адасаблення. Паўпрэдыкатыўныя і ўдакладняльна-паясняльныя адасобленыя члены сказа.

52. Адасобленыя азначэнні (дапасаваныя і недапасаваныя), прыдаткі. Знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях і прыдатках.

53. Адасобленыя акалічнасці, дапаўненні. Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях і дапаўненнях.

54. Адасобленыя ўдакладняльна-паясняльныя члены сказа (удакладняльныя, паясняльныя, абмежавальна-вылучальныя, далучальныя).

55. Сказы з параўнальнымі канструкцыямі. Спосабы выражэння параўнання. Параўнальныя звароты, іх дзве сэнсавыя разнавіднасці: вобразныя параўнальныя звароты і параўнальна-раўналежныя звароты. Адрозненне параўнальных зваротаў ад даданых параўнальных частак складаназалежнага сказа.

56. Пабочныя канструкцыі (словы, словазлучэнні, сказы). Значэнне і функцыя пабочных канструкцый.

57. Устаўныя канструкцыі, іх функцыі ў сказе. Тыпы ўстаўных канструкцый (адзінкі неканструкцыйнага і канструкцыйнага тыпу; устаўныя словы, спалучэнні, сказы).

58. Падабенства і адрозненне пабочных і ўстаўных канструкцый. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях.

59. Зваротак. Спосабы выражэння зваротка. Неразвітыя і развітыя звароткі; адзіночныя, паўторныя і групавыя звароткі. Функцыі звароткаў у мове. Адрозненне зваротка ад вакатыўнага сказа.

60. Сінтаксічны аналіз простага сказа.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “СІНТАКСІС” (СКЛАДАНЫ СКАЗ)

1. Структура складанага сказа, адрозненне яго ад простага сказа. Злучэнне і падпарадкаванне як асноўныя віды сінтаксічнай сувязі частак складанага сказа.

2. Сродкі выражэння сувязі і адносін паміж часткамі ў складаным сказе.

3. Тыпы складаных сказаў: злучнікавыя (складаназлучаныя і складаназалежныя) і бяззлучнікавыя; складаныя сказы з рознымі відамі сувязі.

4. Пераходныя выпадкі паміж злучэннем і падпарадкаваннем у складаным сказе.

5. Агульная характарыстыка складаназлучанага сказа. Складаназлучаныя сказы адкрытай і закрытай структуры.

6. Сувязь частак у складаназлучаным сказе. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі, супраціўнымі, размеркавальнымі злучнікамі.

7. Выражэнне розных сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа. Аднатыпныя і разнатыпныя часткі ў складаназлучаным сказе.

8. Складаназлучаныя сказы з далучальнай сувяззю. Сродкі далучальнай сувязі.

9. Знакі прыпынку паміж часткамі складаназлучанага сказа.

10. Агульная характарыстыка складаназалежнага сказа. Галоўная і даданая часткі. Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай (злучнікі, злучальныя словы, інтанацыя, трывальна-часавыя формы дзеясловаў-выказнікаў, парадак частак і інш.).

11. Роля ўказальных слоў (займеннікаў і прыслоўяў) у галоўнай частцы. Размежаванне злучнікаў і злучальных слоў.

12. Прынцыпы класіфікацыі складаназалежных сказаў у сінтаксічнай навуцы.

13. Складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі і даданымі дапаўняльнымі часткамі, адрозненне гэтых частак.

14. Складаназалежныя сказы з даданымі выказнікавымі і даданымі азначальнымі часткамі, адрозненне гэтых частак.

15. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі (месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступкі (уступальнымі), спосабу дзеяння, меры і ступені, параўнальнымі), даданымі выніку, супастаўляльнымі.

16. Складаназалежныя сказы з даданымі далучальнымі часткамі.

17. Адрозенне даданых прычыны, даданых выніку і даданых уступкі (уступальных) частак у складаназалежным сказе.

18. Адрозненне даданых параўнальных і даданых супастаўляльных у складаназалежным сказе.

19. Знакі прыпынку паміж часткамі складаназалежнага сказа.

20. Агульная характарыстыка складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі. Сузалежнае і паслядоўнае падпарадкаванне даданых частак.

21. Разнавіднасці сузалежнага падпарадкавання (аднароднае і неаднароднае падпарадкаванне частак).

22. Змешанае падпарадкаванне дадачых частак.

23. Сродкі сувязі частак і знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі дадачымі часткамі.

24. Агульная характарыстыка бяззлучнікавага складанага сказа. Сродкі сувязі частак бяззлучнікавых сказаў.

25. Бяззлучнікавыя сказы з аднатыпнымі і разнатыпнымі часткамі, сэнсавыя адносіны ў гэтых сказах.

26. Бяззлучнікавыя складаныя сказы адкрытай і закрытай структуры, сэнсавыя адносіны паміж часткамі.

27. Знакі прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых сказаў.

28. Агульная характарыстыка складанага сказа з рознымі відамі сувязі. Вылучэнне структурных частак паводле актуальнага чляненння сказа. Сродкі сувязі частак у сказах гэтага тыпу.

29. Разнавіднасці складаных сказаў з рознымі відамі сувязі.

30. Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

# ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА-АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 1

*Перабудуйце сказы так, каб замест адасобленых азначэнняў ужываліся дададныя азначальныя часткі. Запішыце перабудаваныя сказы. Растлумачце, чаму ў некаторых сказах такую замену зрабіць нельга або немэтазгодна.*

1. Нізкае неба, засланае шэрай смугою, кожную хвіліну гатова было пырснуць халодным дажджом. 2. Над лесасекай, зарослай густымі кустамі арэшніку, плыло павуцінне бабінага лета. 3. Між галінак, ледзь прыкметных на цёмным небе, віднеліся зоркі. 4. Да горада вяла шаша, абсаджаная старымі разгалістымі асінамі. 5. Маўчала бяскрайняе поле, залітае блеклымі фарбамі захаду. 6. У вячэрнім паветры, вільготным ад блізкай ракі, прыемна пахла шыпшынай. 7. Паабапал гасцінца, зараслага зялёнай мяккай мураўкай, ляжала неагляднае поле залацістага жыта. 8. З мора ўздымалася хмара, падобная на горны хрыбет. 9. Ноч апусціла свой полаг, сатканы з бясконцых сузор'яў.

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 2

*Вызначыце, у якіх складаназалежных сказах з некалькімі дададнымі часткамі правільна вызначана разнавіднасць сказа. Свой выбар абгрунтуйце.*

1. Сцішыўшыся за плотам у ціхім завулку, яны бачылі, як дырэктар выйшаў на ганак, як замкнуў дзверы, як тузануў за дзверы, правяраючя надзейнасць замка (Я.Васілёнак). – складаназалежны сказ з сузалежным аднародным падпарадкаваннем.

2. Калі парою лістападу ў вырай птушкі адлятаюць, яны ў дубровах пакідаюць свае вясновыя напевы, каб не згубіць іх недзе часам у хмарным небе на чужыне (М.Танк) – складаназалежны сказ з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем.

3. Нарцысы своеасабліва, ледзь улоўна пахлі, пахлі так, як звычайна яны пахнуць, калі вырастуць не ў аранжарэі, а пад адкрытым небам на волі (Б. Сачанка). – складаназалежны сказ з паслядоўным падпарадкаваннем.

4. Я хацеў бы, каб промень кожны, што дорыць сонца вясенні̂м днём, што азарае сцяг пераможны, заўсёды ў сэрцы палаў агнём (М.Танк). – складаназалежны сказ са змешаным падпарадкаваннем.

5. Калі падымалася сонца, пачыналася гарачыня, якая трымалася да позняга вечара (А.Чарнышэвіч). – складаназалежны сказ з сузалежным аднародным падпарадкаваннем.

6. Мы накіроўваліся да сядзібы, якая тоне ў зеляніне дрэў, каб паглядзець на двор, на тыя шыбы, у якія некалі ён глядзеў (М. Танк) – складаназалежны сказ з паслядоўным падпарадкаваннем.

## Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 3

*Вызначыце асаблівасці спалучэння дадаneeded частак складаных сказаў. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку, растлумачце іх. Складзіце іх схемы.*

1. Калі прамовы з тым што робіш не разыходзяцца нідзе і без надворнае аздобы мы маем ласку ад людзей (Луж.). 2. Зніклі краскі бы тыя чары мілай казкі якую ў часе вандравання ці адзінокага блукання табе складаюць думкі самі (К-с). 3. Як лёгка і хораша робіцца калі разгорнеш кнігу і адтуль махне галінамі белы зімовы лес сыпанецца за каўнер снегу з-пад крыла спуджанай птушкі (Луж.). 4. Сухамлінскі на канкрэтных прыкладах даказаў што за дваццаць год сваёй працы ні ў адной школе не сустракаў вучняў якія не хацелі б вучыцца з самага пачатку (Пол.). 5. Усё пакінуць след павінна бо як пачаўся белы свет прамень пясчынка і расіна нязменна пакідаюць след (П.Б.).

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПА ДЗЕСЯЦІБАЛЬНАЙ ШКАЛЕ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***10 (дзесяць) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па навучальнай дысцыпліне, модулі;<br>ўменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;<br>творчая самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***9 (дзевяць) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>ўменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>сістэматычная, актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 3. | ***8 (восем) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і |

| | | |
|---|---|---|
| | | прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>ўменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 4. | ***7 (сем) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>свабоднае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>ўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях, напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць іх аналітычную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 5. | ***6 (шэсць) балаў, залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках, вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>ўменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 6. | ***5 (пяць) балаў, залічана*** | дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне |

| | | |
|---|---|---|
| | | яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>ўменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і накірунках па навучальнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў |
| 7. | ***4 (чатыры) балы, залічана*** | дастатковы аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны адказ на пытанні, уменне рабіць вывады без істотных памылак;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>ўменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;<br>ўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках па навучальнай дысцыпліне, модулі і даваць ім ацэнку;<br>работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў |
| 8. | ***3 (тры) балы, не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 9. | ***2 (два) балы, не залічана*** | фрагментарныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, модуля, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 10. | ***1 (адзін) бал, не залічана*** | адсутнасць ведаў і кампетэнцый у аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны |

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| 1. Уводзіны ў мовазнаўства<br>2. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы<br>3. Беларуская дыялекталогія | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | пратакол № __ ад __.__.2025 г. |

# ПРЫКЛАДНЫЯ ЗАДАННІ ДА РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “СІНТАКСІС” (СКЛАДАНЫ СКАЗ)

## Рэйтынгавая кантрольная работа № 1

**Тэмы 1.3. – 1.4.**

***Заданні:***

**І. Спішыце сказы, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначыце від даданых частак у складаназалежных сказах. Пабудуйце схемы сказаў.**

1. Званкі і голас незнаёмы мяне трывожаць кожны раз і тое што знікаеш з дому і тое што вяртаешся не ў час (Грах.).

2. І стала прасіць маладое насенне каб вецер узяў яго з сабою і панёс у аблюбаваную даль (К-с).

3. Тое што хвалявала вялікага хвалюе і цябе (Стр.).

4. Здаецца мне што падбітым самалётам плануе над сасняком каршун (“Полымя”).

5. Лес стаіць паабапал шашы на якой незлічона машын (Хв.).

6. У майстэрні цёпла хаця на вуліцы стаіць зіма (С.).

7. Чым больш было перашкод тым больш расло ўпартае жаданне дабіцца свайго (Вас.).

8. Абстрыгалі з прыходам вясны нажніцамі ліпы і клёны каб цень не кідалі яны на сцежкі з-пад стрэхаў зялёных (М.К.).

9. Былі такія ночы што раса выпадала ўсюды і трымалася аж да таго часу пакуль угрэе сонца (Кул.).

10. Калі ж усё скуюць марозы ў зімовую начную сінь прыходзяць да стажар’яў козы і расахатыя ласі (М.Т.).

11. Параход трымаўся бліжэй да стромкага берага так што ў яго падножжа добра былі бачны серабрыстыя шатры вербаў (Ракіт.).

12. Белы снег Радзіме лёг на плечы нібы акрыў яе пуховы шаль (А.Зв.).

13. Неба стала бясхмарным бы само было з янтара (Пр.).

14. Чым хутчэй набліжалася хмара тым больш зласлівымі рабіліся яе парывы (Нов.).

15. Было светла так што можна было нават чытаць (Шам.).

16. Які розум такая і гаворка (Прык.).

17. Нярэдка здараецца і так што вялікія падзеі маюць для цябе асабісты характар (І.М.).

18. Колькі чалавек у сям’і столькі дрэў садзіць маленькі чалавек стаўшы вучнем школы Сухамлінскага (Віт.).

19. Мы ўсе адзін аднаго павінны трымацца дык гуртам і выйдзе нешта (К.Ч.).

20. Хлопцы рушылі да трох хат што стаялі крыху наводшыбе ад вуліцы (І.Н.).

21. З той пары як пайшлі на аблаву цягнецца іх паляванне да сённяшніх дзён (А.К.).

22. Лёгкі туманок хаваўся ў кустах ад чаго глухлі гукі (П.).

**ІІ. Спішыце сказы, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў, вызначце разнавіднасць падпарадкавання.**

1. Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад аднаго старога аб’ездчыка і гэты народ з яго асаблівай

мовай і звычаямі так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў з гушчы якіх выйшаў Лабановіч гэты некратнуты край старажытнасці якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу і гэты выгляд самой мясцовасці агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч але ў якой таксама было многа цікавага і на яго погляд павабнага (Я.Колас).

2. Хто кнігу мудрасці чытае па зорах травах і вадзе той асалоду атрымае якую не сустрэць нідзе (А. Грачанікаў).

## Рэйтынгавая кантрольная работа № 2

**Тэма 1.5.**

***Заданні:***

**1. Спішыце сказы, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Пісьмова растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа.**

**2. Вызначце іх разнавіднасць (з аднатыпнымі ці разнатыпнымі часткамі).**

**3. Вызначце, якія адносіны выражаюцца паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа.**

1. Густа зелянелі раскідзістыя кусты парэчак агрэсту радамі беглі ўдалеч яблыні грушы слівы (Б.Сачанка).
2. У будныя дні ўставалі рана няма калі хварэць на пана (Я.Колас).
3. Расцягне Юрачка гармонік раздасца кожная хата (Я.Брыль).
4. Мы ўжо не просім міласці ў прыроды прырода моліць літасці ў нас (С.Грахоўскі).
5. З захаду з-за лесу ўсё болей напаўзае шэрых хмар яны грувасяцца адна на другую засланяюць увесь далягляд (І.Навуменка).
6. Цяпер добра разумееш гэты куток быў даспадобы Якубу Коласу тут яму лёгка пісалася (К.Кірэенка).
7. Шануй бацьку з маткаю другіх не знойдзеш (Прыказка).
8. Запяеш па душы дасі ўцехі гасцям поўны гуслі насыплю дукатаў (Я.Купала).
9. Ціха булькатала вада ў канаве сыпалася лісце чырыкалі недзе вераб'і ўсё гэта было такім звыклым добрым прыгожым (М.Гамолка).
10. Адразу ж я заўважыў вецер пачаў дзьмуць нам у бок потым і зусім у твар (Б.Сачанка).

## Рэйтынгавая кантрольная работа № 3

***Тэма* 1.6.**

***Заданні:***

**1. Запішыце тэкст пад дыктоўку.**

**2. Зрабіце сінтаксічны аналіз выдзеленых сказаў.**

***Кольку Бурава нібы падмянілі ў той лістападаўскі дзень, аўтамабіль для яго стаў марай, ён пільнаваў кожную машыну на вуліцы, хоць іх было яшчэ мала, і яму яшчэ мо разы чатыры шчасціла бачыць іх пераважна на станцыі, ля грузавога двара***[1 варыянт]. Яшчэ гады праз чатыры, калі ён добра падрос, на машыне стаў працаваць дзядзька Ігнат, бацька ягонага аднакласніка Стася, і тут ужо Колька ўвесь вольны час прападаў на сядзібе сябра, пільнаваў ягонага бацьку,

калі той прыязджаў на абед, і яны мелі кароценькую магчымасць пасядзець трохі ў цеснай, напечанай сонцам, але такой утульнай кабінцы. Але Стась не дужа захапляўся машынай, яму болей даспадобы былі тру́сы, якіх была процьма ў іхняй варыўні і якія зусім не цікавілі Кольку. І калі неяк летам дзядзька Ігнат узяўся за рамонт свае трохтонкі, яго першым дабраахвотным памочнікам стаў Колька. Спярша ён адціраў ад гразі рысоры, пасля мыў у газе балты і гайкі, памагаў дзядзьку Ігнату разбіраць задні мост – дзе патрымаць ключ, дзе падаць шплінт і шайбу, а то і падлезці дзіцячай рукой туды, дзе не пралазіла рука дарослага чалавека. Затым яны тыдзень корпаліся ў рухавіку, і дзядзька Ігнат тлумачыў хлопцу, навошта патрэбны шатуны і поршні і як яны круцяць каленчаты вал, як перадаецца ягоная энэргія на колы, адкуль і куды ідзе электрычнасць і як яна запальвае гаручае ў цыліндрах. Коля быў хлопец кемлівы і запамінаў усё да драбніц – слава богу, тады ўжо вучыўся ў сёмым класе. Праўда, затым у яго шафёрскай адукацыі настаў перапынак, аж гады тры ён рабіў у леспрамгасе, затое, прызваны на вайсковую службу, адразу папрасіўся ў аўташколу: сказаў камандзіру, што ведае будову аўтамабіля, трэба толькі навучыцца ездзіць. ***Камандзір трапіўся добры, і месяцы праз чатыры маладога чырвонаармейца Бурава залічылі ў аўташколу, дзе ён паказаў найлепшыя здольнасці і па сканчэнні атрымаў шафёрскія правы і па два трохкутнічкі ў пятліцы***[2 **варыянт**]. Пасля ён ужо ні пра што іншае не марыў, як атрымаць машыну і ездзіць на ёй хоць да скону жыцця (312 слоў).

Васіль Быкаў. “У тумане”.

**Парадак сінтаксічнага аналізу складанага сказа з рознымі відамі сувязі**

1. Указаць колькасць прэдыкатыўных частак.
2. Назваць граматычныя асновы кожнай часткі.
3. Назваць:

3.1. асаблівасці арганізацыі структурных частак і характар іх сувязі (на ўзор складаназалежных або бяззлучнікавых і звязаны пры дапамозе злучальных злучнікаў; на ўзор складаназлучаных або бяззлучнікавых і звязаны пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў; на ўзор складаназлучаных або складаназалежных сказаў і звязаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі);

3.2. разнавіднасць сувязі паміж прэдыкатыўнымі часткамі;

3.3. адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі.

4. Назваць сродкі сувязі частак.
5. Схема сказа.
6. Тып сказа.
7. Характарыстыка прэдыкатыўных частак (пры неабходнасці).